■ Добрая кніга – вечная ісціна

# Кнігі – гонар Беларусі!

Агляд падрыхтавала загадчык аддзела мастацтва абласной бібліятэкі імя Я. Карскага Лілія ХАДАРОЎСКАЯ.

Аддзел мастацтва – спецыялізаваны аддзел абласной бібліятэкі, адзіны ў вобласці, дзе назапашана багацейшая калекцыя дакументаў па мастацтве. Акрамя кніг, у ім сабраны выяўленчыя матэрыялы (мастацкія і фотаальбомы, плакаты, паштоўкі, рэпрадукцыі), гуказапісы на розных відах носьбітаў, нотныя выданні, перыядычныя выданні, электронныя дакументы.



**«Слуцкае Евангелле» – унікальны помнік беларускага пісьменства канца XVI ст., адна з праваслаўных святынь Беларусі.** Рукапіс быў створаны ў Слуцку ў 1581 г. і лічыцца ўласнаручным творам слуцкага князя Юрыя Алелькавіча.

Лёс «Слуцкага Евангелля» – цікавая і, можна сказаць, дэтэктыўная старонка нашай гісторыі. Шмат гадоў яно лічылася згубленым. У пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя святыня была перададзена настаяцелю аднаго сталічнага храма прыватнай асобай у знак пашаны за адпяванне памерлага родзіча.

У 2009 годзе выдавецтва Беларускага Экзархата падрыхтавала факсімільнае выданне «Слуцкага Евангелля». У кнізе беражліва адноўлены ўсе асаблівасці арыгінала. Яго вага – 15 кілаграмаў.




**Адно з найбольш каштоўных выданняў – альбом акварэльных малюнкаў беларускай Атлантыды «Дмитрий Струков. Альбом рисунков. 1864–1867».**

Славуты рускі мастак і архітэктар XIX стагоддзя Д. Струкаў царскім загадам быў накіраваны ў экспедыцыю па Беларусі для стварэння альбома духоўных святынь. Яму было даручана зрабіць замалёўкі помнікаў архітэктуры і царкоўных рэліквій, якія засталіся ў краі з часу Старажытнай Русі. Практычна ні адзін з помнікаў беларускай гісторыі і культуры, змешчаных у кнізе, не дажыў да нашых дзён. Але застаўся арыгінальны альбом Струкава, які захоўваецца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта. Больш як 145 гадоў яго практычна ніхто не бачыў.



**Фотаальбом «Зямля сілы. Белавежская Пушча» – свайго роду візітоўка рэспублікі.** Кніга незвычайнага фармата, «апранутая» ў футарал, які імітуе кару шматвяковага дуба, прысвечана 600-годдзю ўстанаўлення запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы. Асноўную частку фотаальбома складаюць высокамастацкія фотаздымкі (больш за 1000) і тэксты з паэмы «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага. Акрамя таго, у кнігу ўвайшлі 12 захапляльных легенд і больш чым 50 вершаў беларускіх паэтаў пра Белавежскую пушчу.



**«Радзівілы. Альбом партрэтаў» – выданне з партрэтамі 165 прадстаўнікоў магнацкага роду Радзівілаў.** На старонках адзінаццаць пакаленняў знакамітай сям'і. Біяграфіі князёў уключаюць інфармацыю пра бацькоў, дзяцей, жонак, даты і месцы нараджэння, хрышчэння і смерці, а таксама пра творчасць той ці іншай персаналіі.

Арыгінал альбома на латыні, які ствараўся некалькімі пакаленнямі знакамітага роду, захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. За апошнія 40 гадоў яго бачылі не больш як 40 чалавек. Для стварэння фаліянта была знойдзена адмысловая акварэльная папера – цёплая навобмацак, з вадзянымі знакамі.



**Фотаальбом у двух тамах «Беларусь созидающая» – адно з самых маштабных ілюстраваных выданняў у гісторыі Беларусі.**

Ва ўнікальным фаліянце 1200 старонак. А на кожнай з іх – пэўны куток Беларусі. 5000 фотаздымкаў паказваюць самыя яркія старонкі гісторыі рэспублікі за апошнія 15 гадоў. Фотаработы прэзентуюць больш за 260 аб'ектаў і будынкаў. Сярод іх Нацыянальная бібліятэка, шматфункцыянальны спартыўна-відовішчны комплекс «Мінск-Арэна», Палац Рэспублікі, палацава-паркавы ансамбль у Нясвіжы, Мірскі замак і інш.

Гродзенская праўда.-2012.- 7 красавіка.- С.5.